**Список литературы:**

1. Куликова, Т. Д. Публицистика А. И. Солженицына. Процесс коммуникации: от информационного бума до информационного вакуума:1960–1994 гг. : дис. ... канд. филол. наук : 10.01.10 [Электронный ресурс] / Т. Д. Куликова. – Режим доступа: http://www.dissercat.com/-content/publitsistika-ai-solzhenitsyna-protsess-kommunikatsii-ot-informatsionnogo-buma-do-informatsi. – Дата доступа: 01.12.2018.
2. Лейдерман, Н. Л. Современная русская литература: 1950–1990-е годы : учеб. пособие : в 2 т. / Н. Л. Лейдерман, М. Н. Липовецкий – М. : Академия, 2003. – Т. 1 : 1953 – 1968. – 416 с.
3. Русская проза конца XX века : учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / В. В. Агеносов, Т. М. Колядич, Л. А. Трубина [и др.] ; под ред. Т. М. Колядич. – М. : Академия, 2005. – 424 с.
4. Савина, Л. М. Стилистические приемы и средства выражения контраста в «Двучастных рассказах» А.И. Солженицына [Электронный ресурс] / Л. М. Савина. – Режим доступа: file:///C:/Users/luda/Downloads/stilisticheskie-priemy-i-sredstva-vyrazheniya-kontrasta-v-dvuchastnyh-rasskazah-a-i-solzhenitsyna.pdf. – Дата доступа: 01.12.2018.
5. Садовская, Е. Ю. Генезис художественного очерка XVIII–XIX веков (проблематика, поэтика, типология) [Электронный ресурс] / Е. Ю. Садовская. – Режим доступа: http://www.vestnik.vsu.ru/pdf/phylolog/2012/01/2012-01-55.pdf19. – Дата доступа: 01.12.2018.
6. Солженицын, А. И. Собрание сочинений : в 30 т. / А. И. Солженицын. – М. : Время, 2006. – Т. 1 : Рассказы и Крохотки. – 672 с.
7. Солженицын, А. И. Угодило зернышко промеж двух жерновов. Очерки изгнания. Часть четвертая (1987–1994) / А. И. Солженицын // Новый мир. – 2003. – № 11. – С. 32–97.
8. Цыганков, Д. «Властитель дум» в поле политики: опыт социоанализа [Электронный ресурс] / Д. Цыганков. – Режим доступа: http://ecsocman.hse.ru/data/093/896/1217/00-5_tsygankov.pdf. – Дата доступа: 01.12.2018.

**Буднік В. А.**
(Брэст, Беларусь).

**УДК [821.161.1 :821.161.3]-005.2**

## ВОБРАЗ-КАНЦЭПТ ЖАНЧЫНЫ Ў АПАВЯДАННЯХ А. САЛЖАНІЦЫНА “МАТРОНІН ДВОР” І І. ПТАШНІКАВА “ТРЫ ПУДЫ ЖЫТА”

***Ключавыя словы**: аўтарская канцэпцыя, сэнсавая напоўненасць вобраза, жаночы вобраз, ідэйна-эстэтычнае ўяўленне.*

***Анатацыя:** выяўлена аўтарская канцэпцыя вобраза жанчыны ў творы рускага пісьменніка А. Салжаніцына “Матронін двор” і ў творы беларускага пісьменніка І. Пташнікава “Тры пуды жыта”. Разгледжаны тыпалагічныя сыходжанні ў лёсе Матроны і Александрыны. Устаноўлена падабенства ідэйна-філасофскіх пазіцый, роля асабістага вопыту аўтараў у асэнсаванні прычын трагедый драматычнага лёсу беларускага і рускага народа ў XX стагоддзі. Падкрэслена ўніверсальна-сэнсавае напаўненне вобраза-канцэпта жанчыны.*

У кожным літаратурным творы можна вылучыць вобразы, якія адлюстроўваюць не толькі аўтарскую канцэпцыю, аўтарскае ўспрыманне свету і чалавека, але і характар той эпохі, у якую быў створаны канкрэтны мастацкі тэкст.

Мастацкая змястоўнасць і сэнсавае напаўненне вобраза жанчыны сталі прадметам даследаванняў бадай што ці не з таго моманту, калі чалавек пачаў мысліць вобразамі, г.зн. з моманту зараджэння мастацтва ў свеце. Мабыць, па

гэтай прычыне аблічча жанчыны як увасабленне мастацкай дасканаласці можна сустрэць у жывапісе і партрэце, музыцы і скульптуры, оперы і балеце. У літаратуры да стварэння вобраза жанчыны мастакі слова звярталіся ўжо на самым пачатку зараджэння літаратурнай творчасці (напрыклад, яскравы вобраз Пенелопы ў гамераўскай «Адысеі»). Выдатныя жаночыя вобразы ствараліся і ў іншых вядомых творах сусветнай і беларускай літаратуры: вобразы Лаўры ў Петраркі, Ганны ў "Новай зямлі Якуба Коласа, Марылі ў А. Міцкевіча , абагульнена-сімвалічны вобраз Мамы ў кнізе паэзіі "Евангелле ад Мамы" Р. Барадуліна, вобразы жанчын-матуль у аповесці А. Жука "Сны пра маму", апавяданні Змітрака Бядулі "На Каляды к сыну" і мн. інш.

Станаўленне і ідэйна-эстэтычнае напаўненне жаночых вобразаў у розныя перыяды гісторыка-літаратурнага працэсу адлюстроўвае змены ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Канцэптуальна-сэнсавае напаўненне жаночых вобразаў у мастацкай літаратуры нярэдка з'яўляецца індыкатарам, адметнасцю светапогляду пісьменніка. Тыпалогія мастацка-літаратурных жаночых вобразаў, як правіла, характарызуе структуру грамадства і ўказвае, якое месца ў сучасным аўтарскім свеце займае жанчына. Вобраз-канцэпт *жанчыны* застаецца адным з асноўных у літаратуры і мастацтве. Ён мае шырокае, традыцыйна гуманістычнае ўніверсальна-сэнсавае напаўненне. У славянскіх літаратурах гэты вобраз-канцэпт з'яўляецца ўвасабленнем жыцця, яго нараджэння і захавання. Жанчына ў славянскім фальклоры і літаратуры – гэта захавальніца сям'і, роду, увасабленне жыццядайнасці, трывушчасці.

Цікавым у гэтым плане бачыцца параўнанне апавяданняў рускага пісьменніка А. Салжаніцына "*Матронін двор"* і беларускага пісьменніка І. Пташнікава "*Тры пуды жыта"*. Галоўнымі ў абодвух творах з'яўляюцца вобразы тыповых гераінь, прадстаўніц рускай і беларускай вёсак у драматычныя пасляваенныя дзесяцігоддзі. Ствараючы жаночыя вобразы, пісьменнікі ў сваіх творах апісваюць тыя чалавечыя якасці, якія шмат у чым, забяспечваюць цэласнасць, непарушнасць гэтага свету, імкненне да гармоніі ў ім. Жанчына ў творчай канцэпцыі як А. Салжаніцына, так і І. Пташнікава аказваецца здольнай захоўваць любоў і адстойваць гуманістычныя каштоўнасці.

Апавяданне «*Матронін двор*» передае рэальныя падзеі, якія адбываліся ў жыцці А. Салжаніцына – тут адлюстраваны перыяд жыцця пісьменніка ў 50-я гады ў сярэднярускай вёсцы, дзе ён пасля вызвалення з лагера працаваў настаўнікам у школе. Вобраз Матроны Васільеўны ў аповесці з'яўляецца цэнтральным. Гераіня прадстаўлена ва ўспрыманні апавядальніка – мужчыны, які гаворыць ад першай асобы, што ўзмацняе рэалістычную, аўтабіяграфічную інтэнцыю твора. Матрона – гаспадыня, у якой кватаруе настаўнік. Яна – не самая лепшая гаспадыня, здольная дагадзіць хіба што такому непатрабавальнаму кватаранту, якім з'яўляецца былы асуджаны: «Не всегда было посолено, как надо, часто пригорало … Я покорно съедал все наваренное мне, терпеливо откладывал в сторону, если попадалось что неурядное: волос ли, торфа кусочек, тараканья ножка» [2, с.171]. Аднак гэтая знешняя неахайнасць хавае высокія ўнутраныя якасці характару Матроны Васільеўны, якія не могуць па вартасці ацаніць яе аднавяскоўцы. Матрона не ўмее зайздросціць. Нягледзячы на ўсе свае беды, яна ўспрымае поспехі іншых добразычліва.

У апавяданні І. Пташнікава *"Тры пуды жыта"* (у адрозненні ад апавядання А. Салжаніцына) аповед вядзецца ад імя аўтара-апавядальніка, але праз прызму ўспамінаў галоўнай гераіні Александрыны пра яе драматычнае жыццё. Александрыне за яе мужа Сяльвестра, рэпрэсаванага ў трыццаць сёмым годзе, выдалі ад калгаса пасля яго рэабілітацыі тры пуды жыта і лапік сенажаці: «Адкупіцца хочуць. У тры пуды жыта ацанілі чалавека. І вязка сена — наверх...» [1, с. 473].

Супастаўляючы вобразы Александрыны і Матроны, мы бачым шмат падобнага ў іх лёсах. Так, Матрона перажыла дзве вайны, смерць 6 дзяцей, страту мужа. Яна гераічна змагаецца са сваёй страшнай хваробай. Муж пташнікаўскай гераіні Сяльвестра, здаровы, малады чалавек, быў рэпрэсаваны і знік, быццам яго і не было ніколі. Ад яго не засталося нават магілы, толькі пісьмо аб рэабілітацыі.

Як Александрына, так і Матрона з'яўляюцца мацярамі. У Александрыны было трое дзяцей. Лёс Матроны Васільеўны як маці вельмі трагічны і сумны: дзяцей ў яе было шасцёра, але адзін за адным паўміралі ўсе вельмі рана. Нерастрачаную мацярынскую любоў яна аддае сваёй выхаванцы Кіры, дачцэ яе першага каханага Фадзея. А. Салжаніцын, малюючы лёс Матроны, паказвае, што адсутнасць родных дзяцей не перашкаджае жанчыне праявіць сваю мацярынскую сутнасць, бо місія мацярынства заключаецца не толькі ў нараджэнні дзяцей. Мацярынства ва ўяўленні А. Салжаніцына – гэта глыбінная, прыроджаная якасць жанчыны, звязаная з любоўю да дзяцей, з разуменнем іх, і з уменнем дзяліцца сваім душэўным цяплом, выконваючы сваё прызначэнне і дорачы сапраўдную матчыну любоў. І, як мы бачым, гэта ў салжаніцынскай гераіні ўдаецца поўнасцю. Пісьменнік падкрэслівае, што толькі Кіра на памінках па-сапраўднаму плача па Матроне, шкадуючы аб страце дарагога чалавека: "…рыдала злосчастная матренина приёмная дочь – та Кира из Черустей, для которой ломали и везли эту горницу. (…) Она невменяемая ходила от гроба приёмной матери в одном доме к гробу брата в другом (…) [2, с.199].

Для абодвух пісьменнікаў важна, што носьбітам жыццёвай сілы з'яўляюцца жанчыны, на якіх, як паказана ў творах, трымаецца зямля, сяло. А. Салжаніцын і І Пташнікаў ствараюць вобразы жанчын з моцным характарам, але з нямоглым целам: Матрона Васільеўна пакутуе ад невылечнай хваробы, пташнікаўская Александрына ў канцы твора стаіць амаль на парозе смерці, яна слабая і старая: "Кальнула ў грудзях. Горла сціснула сухая сіпка – не дыхнуць… Падаючы, яна яшчэ ўбачыла, як зразае касой, шырокай, бліскучай, вострай, адсохлыя галоўкі шэрага бабка…Яе знайшла Волька – дачка. (…) Падняла, як магла, з пакосу, і прывяла дамоў" [1, с. 480].

Рускага і беларускага пісьменнікаў збліжае творча-эстэтычная задача – паказаць чытачу менавіта гарманічны вобраз жанчыны. Аўтараў хвалюе і духоўная, і фізічная дасканаласць. Так, Матрона ў пачатку не ўяўляецца апавядальніку прыгожай: «...кругловатое лицо хозяйки показалось мне желтым, больным. И по глазам ее замутнённым можно было видеть, как болезнь измотала ее» [2, с. 167]. Але паступова вобраз Матроны ўскладняецца, і аўтар раскрывае яе сапраўдную прыгажосць. Напрыклад, апавядальнік адзначае, што Матрона валодае «лучезарной улыбкой» [2, с. 172], і гэта для яго значыць значна больш, чым правільнасць рыс або прыгажосць. Аўторская канцэпцыя

жаноцкасці ўключае не толькі знешнюю прыгажосць, але найперш унутраную прыгажосць – дабрыню.

“Высокая, ценкая, высахлая за сваё праклятае бязмужнае адзінокае жыццё на трэску – адна гадавала трое дзяцей, бегала кожны дзень у калгас ад цямна да цямна па народзе, насіла кляймо сям’і “ворага народа”, памагала ў вайну партызанам, рвала жылы пасля вайны пры бясхлебіцы, пакуль не састарэла і пакуль не перасталі да яе чапіцца калгасныя брыгадзіры, каб ішла араць, баранаваць, жаць, выкідаць з праварын гной, палоць, выбіраць бульбу, даглядаць, малаціць, калаціць… Гэтулькі ўсяго перарабілі рукі з кляймом, згінь ты, благое, прападзі, што цяпер зусім адсыхаюць: круціць іх, выварочвае ў суставах кожную ноч…” [1, с. 457] . Такім было драматычнае і цяжкае жыццё Александрыны ў апавяданні І. Пташнікава.

Унутраная стойкасць, сіла характару – важная тыпалагічная рыса, якая аб'ядноўвае гераінь А. Салжаніцына і І. Пташнікава. Яны пакутуюць, але ўспрымаюць жыццёвыя пакуты стойка, нікога не абвінавачваючы ў сваіх бедах. Наадварот, выпрабаванні не надламалі іх, не зрабілі злоснымі на ўвесь свет, а дапамаглі ім стаць мацнейшымі.

Гераіні І. Пташнікава і А. Салжаніцына надзелены пачуццём высокай духоўнасці, якая спалучаецца з бескарыслівасцю. Матэрыяльны бок жыцця цікавіць іх значна менш, чым многіх навакольных людзей. Вядома ж, яны ўсведамляюць, што жыццё немагчымае без грошай і матэрыяльных выгод: Матрона Васільеўна спрабуе “выхлопотать” сабе пенсію, каб хоць неяк звесці канцы з канцамі. Але не хапае ў яе настойлівасці паклапаціцца аб сабе, жанчына застаецца без пенсіі: “Хлопоты были – добыть эти справки; и чтоб написали все же, что получал он (*муж* – Б. В.) в месяц хоть рублей триста; и справку заверить, что живет она одна и никто ей не помогает; и с года она какого; и потом все носить в собес; и перенашивать, исправляя, что сделано не так; и еще носить…” [2, с. 172]. І гераіня беларускага пісьменніка, Александрына, хоча адмовіцца ад таго, што ёй выпісалі ў калгасе: “Нікуды я не хадзіла і не пайду. І вон з хаты…” [1, с.473]. Пры гэтым матэрыяльны клопат таксама адыходзіць на другі план перад маральным, духоўным, што праяўляецца, напрыклад, у бескарыслівым клопаце абедзвюх гераінь аб бліжніх.

А. Салжаніцын у вобразе Матроны вельмі яскрава падкрэсліў важную і не дужа тыповую якасць характару сваёй гераіні – здольнасць да спачування. Пісьменнік паказвае, што спачуванне не робіць жыццё прасцей, наадварот: спачуваючы, жанчына губляе сваю маёмасць (у Матроны няма нічога) і нават жыццё (дапамагаючы іншым, Матрона гіне пад калёсамі цягніка). Шкадаванне іншых і жаданне дапамагаць навакольным – не спосаб забыцца пра ўласныя пакуты. Гэта і не пустая цікаўнасць да чужога жыцця, а глыбокае ўнутранае пачуццё, неад'емная рыса характару гераіні. Матрона Васільеўна спачувае сяброўцы Матроне, якую б'е муж, яна шкадуе нават парася: "Трижды в день варить ему, жить для него – и потом зарезать и иметь сало" [2, с. 204]. Яна гатова абараняць кожную жывую істоту. Гэтыя спачуванне і шкадаванне да ўсяго жывога павялічваюць духоўна-этычны патэнцыял сілы характару гераіні. Як і Александрына, Матрона знаходзіць суцяшэнне ў працы і «...ко всякой работе ловка». Аўтар заўважае: «...у неё было верное средство вернуть себе доброе расположение духа – работа» [2; с.173]. Устае Матрона штодня ў чатыры-пяць

гадзін раніцай. Капае «картовь», ходзіць за торфам, «по ягоды в дальний лес», і «...на каждый день приходилось у неё какое-нибудь дело»[2; с.173].

А. Салжаніцын не раз падкрэслівае, што працуе Матрона не толькі па неабходнасці – праца прыносіць задавальненне, нават у старасці, калі яна моцна хварэе. Гэта якасць характэрна і для вобраза Александрыны. Цяжкая фізічная праца ў калгасе і на сваёй гаспадарцы з'яўляецца неад'емнай часткай яе жыцця. Для Матроны неўласціва спажывецкае стаўленне да жыцця, для яе неабходна аддаваць, а не браць. Пры гэтым Матрона выдатна ўсведамляе, як цяжка яна жыве. Працавітасць выступае спрадвечнай, характэрнай рысай для абедзвюх гераінь.

І. Пташнікаў ў сваім творы шмат месца адводзіць пачуццям і перажываннім Александрыны. Перад намі ўспыхваюць на кароткі час невялікія эпізоды з мінулага жыцця Александрыны. Часта такія эпізоды ўтрымліваюць толькі адзін-два сказы, але гэтага дастаткова, каб стварыць не толькі жывую і горкую гісторыю яе незайздроснага лёсу, але і адчуць, як пад прэсам войн і рэпрэсій скажалася і нявечылася душа ўсяго народа: “У Амерыку я паехала (…) у заработкі” [1, с. 462]. Паставіўшы ў цэнтр мастацкага спасціжэння, адлюстравання і аналізу цяжкую народную памяць аб перажытым праз вобраз гераіні, І. Пташнікаў апасродкавана ўступае ў палеміку з такой, здавалася б, аксіяматычнай ісцінай аб тым, што перанесеныя пакуты ўзвышаюць дух чалавека, загартоўваюць характар. З аднаго боку, гэтая думка, бясспрэчна, мае права на існаванне і можа быць пацверджана як прыкладамі з жыцця, так і некаторымі літаратурнымі творамі. Часы гістарычных нягод бескампрамісна правяраюць усе ідэйныя, духоўныя, маральныя рэсурсы чалавека. І ад таго, якімі будуць гэтыя рэсурсы, залежыць характар яго ўдзелу ў тым, што адбываецца. Аднак, па нашым меркаванні, драматызм гістарычных падзей, недасканаласць бытавых варункаў, цяжкасці і страты не заўсёды абумоўліваюць характар і свядомасць чалавека. Нягледзячы на перанесеныя крыўды і цяжкасці, гераіні абодвух пісьменнікаў не страцілі душэўную чуласць і дабрыню.

Праз жаночыя вобразы ў названых творах беларускага і рускага пісьменнікаў выразна перадаецца жыццё эпохі, складаныя грамадска-гістарычныя падзеі, якія паўплывалі на драматызм лёсу Матроны і Александрыны. У апавяданнях адметна перадаецца жыццё беларускай і рускай вёскі 50- х гадоў, драматызм жыцця таго часу, часта бяспраўе ў вёсцы жанчыны. Так, у апавяданні “Матронін двор” А. Салжаніцын паказвае, як моцна змянілася жыццё, душа і маральныя арыенціры сялянства пасля ўкаранення калгасаў і правядзенне гвалтоўнай калектывізацыі. У гэтым творы аўтар паказвае крызіс рускай вёскі, які пачаўся адразу пасля сямнаццатага года. Спачатку грамадзянская вайна, затым калектывізацыя, раскулачванне, сялян знішчалі, абяскроўлівалі рускую і беларускую вёску. Сяляне былі пазбаўленыя ўласнасці, яны страцілі стымулы да працы. Глухая вёска, у якой апынуўся наратар, расчаравала яго: “Увы, там не пекли хлеба. Там не торговали ничем съестным. Вся деревня волокла снедь мешками из областного города” [2, с. 170]. А. Салжаніцын паказвае крызіс рускай вёскі пасля рэвалюцыі. Многія мужчыны загінулі ў сталінскіх лагерах або на вайне. Жанчына засталася сама, без падтрымкі мужчыны. Матрона, прапрацаваўшы ўсё жыццё ў калгасе, нават пенсію не атрымлівае. Жыве бедна, побыт неўладкаваны: разам з ёю ў няўтульнай хаце – мышы, прусакі. Яна нічога не нажыла, акрамя фікусаў, казы, “калченогой” коткі і паліто, перашытага з

шыняля. Не абыйшла бокам і калектывізацыя: у калгасе гераіня прапрацавала ўсё жыццё « ...не за деньги – за палочки» [2,с.175].

Гераіня І. Пташнікава таксама жыве менавіта ў такі ж час. Яе мужа Сяльвестра першы раз арыштаваў пагранатрад у 1933 годзе. Ні ён, ні яна не ведалі за што. У 1935 годзе ён адсядзеў тры месяцы за тое, што трапіўшы на мароз, згніла ў парніку калгасная бульба. У 1937 годзе арыштавалі трэці раз і ўжо не выпусцілі. Праз дваццаць гадоў, толькі ў 1958 годзе, Сяльвестра быў рэабілітаваны пасмяротна. “Дваццаць гадоў яна помніла, што Сяльвестра няма, але ўсе дваццаць гадоў думала, што ён жывы. Помніла, але не памінала… А трэба было памінаць…. Аж дваццаць гадоў….” [1, с. 470]. І такое было не толькі з ёю, такой была не яна адна. Пісьменнік з выключнай мастацкай сілай і псіхалагічнай перакананасцю змог паказаць, што значылі сталінскія рэпрэсіі не толькі для тых, хто быў рэпрэсаваны, але і для ўсяго народа. Яны парушалі спрадвечныя асновы жыцця, калечылі людскія душы. Выратоўвалі Александрыну штодзённыя клопаты пра дзяцей і пастаянная праца – цяжкая, знясільваючая, з цямна да цямна. Дзяцей трэба было карміць, апранаць, выхоўваць, вучыць. У канцы твора ачуняўшы пасля страшэннага стрэсу, Аляксандра глядзіць на фотаздымкі дзяцей і думае: “Вот без вас, дзеці, нішто на зямлі не вечнае…” [1, с. 480].

Аналіз твораў А.Салжаніцына і І. Пташнікава дазваляе казаць аб тым, што пісьменнікам удалося стварыць унікальна-тыповыя канцэптуальныя жаночыя вобразы – самаахвярных, трывушчых рускай і беларускай жанчын. Гэтыя творы істотна дапаўняюць галерэю жаночых вобразаў у рускай і беларускай літаратурах, канкрэтызуюць і паглыбляюць ідэйна-эстэтычныя ўяўленні сучаснікаў аб вялікай ролі жанчыны ў драматычныя часы, якія давялося пераажыць грамадству ў ХХ стагоддзі. Прааналізаваныя апавяданні дапаўняюць канцэпцыю выключна стваральнай функцыі жанчыны ў соцыуме і светабудове наогул. Так, для жанчыны, па А. Салжаніцыну, важныя дабрыня, спачуванне да ўсяго жывога, душэўнасць; уменне разумець кожнага – і чалавека, і жывёлу. Пташнікаўская гераіня таксама ўвасабляе жыццёвую трывушчасць, бескарыслівасць, працавітасць і цягавітасць, непрыманне бяздзейнасці і гультайства, здольнасць да сапраўднай любові. Гераіня А. Салжаніцына ўражвае самаахвярнасцю. І. Пташнікаў у апавяданні змог стварыць глыбока жыццёвы, гістарычна абумоўлены, надзелены прыродай і сацыяльнай жыццяўстойлівасцю эпічны нацыянальны жаночы характар. Вобразы жанчын у разгледжаных творах увасабляюць драматычны лёс беларускага і рускага народа ў ХХ стагоддзі. Без жаночай вернасці зямлі і працы на ёй, без сумленнасці, любові да дзяцей і адданасці сям’і, без вялікай жаноцкай трываласці і веры ў жыццё, у перамогу дабрыні немагчыма было б выжыць і перамагчы вялікія грамадскія драмы і трагедыі.

Такім чынам, вобраз-канцэпт жанчыны ў А. Салжаніцына і ў І. Пташнікава ёмісты і адначасова гістарычна канкрэтызаваны. Разам з тым, кожны аўтар стварыў і пэўны ідэал жанчыны. Пісьменнікам, кожнаму па-свойму было важна стварыць вобразы, у якіх выяўлены ўяўленні аб лепшых жаночых рысах. І для сучаснага чытача – яны арыенцір, сімвал вечных і лепшых жаночых якасцяў.

**Спіс літаратуры:**

1. Пташнікаў, І. М. Выбраныя творы / І. Пташнікаў ; уклад. прадм., камент. С. Андраюка. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 572 с.

2. Солженицын А. И. Матренин двор : рассказы / А. И. Солженицын. – М. : Дет. лит., 2009. – 220 с.